лянскі падворак у гэтых творах падвышаецца да казачна прыгожых палацаў, а іхнія гаспадары — да знакамітых паноў, нават да зор нябесных. Напрыклад, у шчадроўскім рэпертуары:

Багаты двор — Пятра дом.
Каля яго двара ўсё шаўковая трава,
Усё шаўковая трава, усё жалезны тын.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
На яго двары ды чатыры церамы
стаяць:
У першым цераму — ясны месяц,
Другі церам — ясная зара,
Трэці церам — дробны звёздачкі,
Чацвёрты церам — буён вецер:
Ясен месяц — сам гаспадар,
Ясная зара — яго жана,
Дробны звёздачкі — яго дачушкі,
Буён вецер — яго сын...

Сын гаспадара ў шчадроўскіх песнях параўноўваецца з каралём, царом, князем; яго дачку ў царкве «не пазналі ды каралеўнай назвалі». Сыны гаспадара клічуць сваіх коней:

У першага каня — залатая грыва,
У другога каня — срэбны капыт,
У трэцяга каня — шаўковы хвасцец.
Сыны сустрэлі трох паненак:
Першая паненка, што ў золаце,
Другая паненка, што ў серабры,
Трэцяя паненка, што ў бархаце.
(«За дуброваю, за зялёнаю»)

Узнёслыя лексіка і танальнасць дамінуюць у дажынкавых песнях:

Жыта пажалі,
У копы паклалі:
Ой, часта, густа,
На небе звёзды,
Ой, часцей, гусцей,
На полі капы.
(«Павейце, ветры»)

У валачобных песнях сялянскі двор прыпадабняецца да палаца, што «між азёр стаіць на пагурачку»; у ім «шулы точаныя, пазалочаныя»; на падворку «паня ходзіць, залатыя ключы ў руках носіць». Гаспадыня «на ціхі Дунай па ваду хадзіла, да брала яна вёдры ўсё новыя, да пачопачкі атласныя, да каромысел — янтаровы корань». Яна чэрпае вядром «усё срэбра і золата». Узнёслы настрой на Вялікдзень акцэнтуецца рэфрэнамі «Хрыстос уваскрос на ўвесь свет!», «Вясна красна на ўвесь свет!», таўталагічнымі эпітэтамі:

Па мяжы хадзіў,
Жыта глядзеў,
Да ў коласе каласістае,
Да ў корані караністае.

У жніўных песнях ёсць цыклы «Золата, золата!», дзе ўсё набывае нябесна-ўзнёслы вобраз:

Жыта маё, жыта залатое,
Золата, золата на таку малочана!

У вясельных песнях малады набывае вобраз князя, а маладая — княгіні з дружынамі. Так, сірата на магіле маці кліча яе на Вяселле і звяртаецца да неба:

Да стань, Божа, на куце,
Дый дай долю сіраце, сіраце!

Узнёсламу настрою на вясельным абрадзе кантрастуюць камічныя інтэрмедыі і гратэскавыя прыпеўкі:

Наш Іванька на коніку,
Як таракан у апалоніку,
Наша Аленка на пасадзе,
Як жабка ды на расадзе.

або

А што-то ў лузе квохча, квохча?
Малады свінню смокча, смокча,
А маладая памагае, памагае,
За хвост свінню пацягае, пацягае.

*Літ.*: Зімовыя песні. Мн., 1975. С. 154—155; Легенды і паданні. Мн., 1983. С. 51; Вяселле: Песні. Мн., 1985. Кн. 4. С. 365—428.

*У. М. Конан.*

**УЛАЗІНЫ**, у х о д з і н ы, пераходны абрад, які фіксаваў завяршэнне будаўніцтва хаты і распачынаў працяглы перыяд яе «ажыўлення». Меў сімвалічную прывязку да каляндарнага часу выканання. На працягу года вылучалі шчаслівыя і нешчаслівыя дні. Напрыклад, калі пачатак будаўніцтва хаты прымяркоўвалі да часу паміж Вялікаднем і Тройцай («Без Тройцы дом не строіцца»), то засяленне ў пабудаваны дом часцей за ўсё суадносілі з днём 14 верасня (ушанаванне святога Сямёна) або 4 снежня (дзень Увядзення Багародзіцы ў храм), пры гэтым абавязкова ўлічвалі фазу Месяца (найбольш спрыяльным лічыўся час ад маладзіка да поўні), каб у хаце заўсёды быў дастатак і дабрабыт. Пераход у новую хату — рытуал складаны і шматаспектны. У асяроддзі славянскіх народаў было распаўсюджана павер'е аб тым, што новабудоўля абавязкова запатрабуе ахвяру, таму старыя людзі не хацелі перасяляцца ў новую хату, баючыся хутка памерці. Па гэтай прычыне першай у хату пускалі чорную кошку. Лічылі, што яна заўсёды знойдзе паразумен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не з нячысцікамі — жывымі застануцца і гаспадар, і кошка. На падворак першым запускалі пеўня — без яго скаціна не вялася, карова не даілася і інш. Перад тым як з'ехаць на новае месца, у старой хаце старанна прыбіралі і нічога не пакідалі пасля сябе. Не рабілі толькі тыя рэчы, якія выкарыстоўваліся ў пахавальным абрадзе. У новую хату пераносілі мэблю, посуд, адзенне, крыху смецця з падлогі старой хаты, калі ў ёй добра жылося. У старой хаце рабілі рошчыну, накрывалі дзяжу з цестам вывернутым кажухом, пераносілі ў новую хату і ўжо там выпякалі хлеб. Таксама гаспадыня забірала хатні абраз і гаршчок з вугольчыкамі: «Без гэтага не будзе ранейшага дабрабыту». Нар. ўяўленне аб дабрабыце ў хаце было звязана з Дамавіком. Выконвалі шэраг абрадавых дзеянняў, каб запрасіць яго са старой хаты ў новую: на гарышчы ставілі пачастунак — кавалак хлеба з соллю і чарку гарэлкі, прыносілі ў новую хату стары венік — сімвалічнае месца яго жыхарства. Калі ў новы дом засялялася бяздзетная сям'я, то першай пасля «рытуальных» жывёл прасілі зайсці цяжарную жанчыну, каб у новай хаце нараджаліся дзеці. Калі ў хату засялялася сям'я пчаляра, гаспадар, перад тым як зайсці, мазаў мёдам чатыры вуглы хаты: «Каб жыццё было салодкае». Святочнае застолле спраўлялі ўрачыста, як вяселле. Накрывалі багаты стол, запрашалі гасцей — сваякоў і суседзяў, якія прыходзілі з падарункамі і пажаданнямі шчаслівага жыцця ў новай хаце. Абжыванне новай хаты і «ўжыўленне» ў яе прастору доўжылася на працягу ўсяго першага года жыцця, аднак найбольш адказнымі былі першыя 7—9 дзён, на працягу якіх гаспадар чытаў малітвы, звернутыя да святых ахоўнікаў жытла, прамаўляў спецыяльныя магічныя замоўныя формулы: «Хата, камната, на ўсё штоб была багата і на людзей здарова».

*Літ.:* Замовы. Мн., 1992. С. 47; Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001; Крук Я., Котович О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003.

*А. В. Катовіч.*

**УЛА́С**, гл. *Аўлас.*

**УЛА́ШЧЫК** Мікалай Мікалаевіч (14.2.1906, в. Віцкаўшчына Дзяржынскага р-на — 14.11.1986), гісторык, археограф, этнограф, краязнавец, літаратар. Доктар гістарычных навук (1964). Скончыў БДУ (1929). У 1924—30 працаваў у Бел. дзяржаўнай бібліятэцы і Кніжнай палаце Беларусі. Адзін з заснавальнікаў і актыўных удзельнікаў краязнаўчага гуртка ў БДУ, выдання «Летапіс беларускага друку». Удзельнічаў у края-знаўча-навуковых экспедыцыях на Міншчыне і Палессі. Пачынаючы з 1930-х г. неаднаразова быў рэпрэсіраваны. У 1955—86 працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН СССР. У серыі «Поўны збор рускіх летапісаў» падрыхтаваў і выдаў 32-і (1975) і 35-ы (1980) тамы бел.-літоўскіх летапісаў, матэрыял якіх дазваляе высветліць гістарычны кантэкст гадавых свят бел. нар. календара, прынцыпова важны пры даследаванні каляндарна-абрадавага фальклору. У публікацыях «Была такая вёска» (асобнае выданне 1989), «Хроніка» (1991—97) асвятляецца жыццё бел. сялянства, яго матэрыяльная і духоўная культура на працягу канца 19 — 1-й трэці 20 ст. Высока цаніў традыцыйную духоўную культуру беларусаў, асабліва валачобныя песні. Яго першыя этнаграфічна-краязнаўчыя назіранні і запісы, аб'яднаныя ў выданні «Краязнаўства: Нататкі пра бадзянні ў 1924—1929 гг.: З рукапіснай спадчыны» (1999), акрамя навуковага этнаграфічна-краязнаўчага характару даюць уяўленне пра грамадскую атмасферу 1920-х г., зацікаўленасць інтэлігенцыі ў навуковым падыходзе да вывучэння фальклору.

*А.С. Ліс.*

**УМО́ЎНАСЦЬ**, агульная ўласцівасць мастацкай творчасці, якая маркіруе яе спецыфіку, сутнаснае адрозненне ад эмпірычнай рэальнасці, тэарэтычнага пазнання і практычных ведаў, пераўтварае быццё, ствараючы віртуальныя або фантастычныя вобразы і сюжэты, выкарыстоўваючы мастацкія *тропы*. У гістарычным развіцці мастацкай культуры выявіліся тры ўзроўні У. На этапе непасрэднага пачуццёва-вобразнага пазнання мастацтва ўмоўнае ў тым сэнсе, што яно ёсць толькі калектыўны цэласны вобраз (гл. *Міфалагемы*), які ўспрымаецца як рэальнасць вышэйшага парадку. На ўзроўні эстэтычнай тыпізацыі рэальнае і ўмоўнае суаднесены ў адносна гарманічнае адзінства — найбольш поўнае ў класічных формах рэалізму, з перавагай умоўнага ў класіцызме, рамантыз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ